ЗАЦВЕРДЖАНА
Прарэктар па вучэбнай працы
ўстановы адукацыі
"Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А.С.Пушкіна"
_____________С.А.Марзан
«___»______________2024 г.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Дэкан філалагічнага факультэта
ўстановы адукацыі "Брэсцкі
дзяржаўны ўніверсітэт
імя А.С.Пушкіна"
_____________Т.В.Сянькевіч
«21» ___10_____2024 г.

# ПАЛАЖЭННЕ
## аб завочнай алімпіядзе па беларускай літаратуры для навучэнцаў старэйшых класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі

### АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Завочная алімпіяда па беларускай літаратуры скіравана на абуджэнне цікавасці да прафесіі педагога, да філалогіі, да даследчай і творчай дзейнасці ў гэтым накірунку.

Змест заданняў Алімпіяды па беларускай літаратуры (далей Алімпіяда) накіраваны на развіццё самастойнай творчай дзейнасці старшакласнікаў.

Заданні рассылаюцца навучэнцам для выканання ў вольны час за месяц да падвядзення вынікаў.

Пераможцы Алімпіяды ў **снежні 2024 г.** будуць запрошаны на філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна (далей БрДУ імя А.С. Пушкіна) для падвядзення вынікаў, узнагароджання, знаёмства з факультэтам.

### АРГАНІЗАТАР АЛІМПІЯДЫ

Арганізатарам Алімпіяды з'яўляецца кафедра беларускага і рускага літаратуразнаўства і журналістыкі БрДУ імя А.С. Пушкіна.

### АРГКАМІТЭТ АЛІМПІЯДЫ

1. Мельнікава З.П., прафесар кафедры беларускага і рускага літаратуразнаўства і журналістыкі, доктар філалагічных навук, прафесар;
2. Кавалюк А.С., дацэнт кафедры беларускага і рускага літаратуразнаўства і журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
3. Шчэрба С.М., дацэнт кафедры беларускага і рускага літаратуразнаўства і журналістыкі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
4. Пітэнка А.М., начальнік вучэбна-метадычнага цэнтра развіцця агульнай сярэдняй адукацыі на ІІ і ІІІ ступенях ДУА "Брэсцкі абласны інстытут развіцця адукацыі" (па ўзгадненні).

### МЭТА І ЗАДАЧЫ АЛІМПІЯДЫ

**Мэта** – фарміраванне цікавасці да беларускай літаратуры і мастацкага слова; выпрацоўка зацікаўленых адносінаў да прафесіі славесніка.

**Задачы**:

- выяўленне і заахвочванне навучэнцаў, здольных да авалодвання прафесіяй педагога-філолага;
- удасканаленне форм прафарыентацыйнай працы па філалогіі.

## УДЗЕЛЬНІКІ АЛІМПІЯДЫ

Да ўдзелу ў Алімпіядзе запрашаюцца навучэнцы **10-11** класаў агульнаадукацыйных устаноў Брэста і Брэсцкай вобласці.

## УМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ АЛІМПІЯДЫ

Алімпіяда праводзіцца ў завочнай форме. Камплект дакументаў рассылаецца па электроннай пошце зацікаўленым навучэнцам для выканання заданняў у вольны час.

Апошні тэрмін прыёму прац – **30.11.2024** (уключна).

## ПАРАДАК НАКІРАВАННЯ РАБОТ НА АЛІМПІЯДУ І ПАВЕДАМЛЕННЯ ВУЧНЯМ АБ ВЫНІКАХ УДЗЕЛУ

1. Працы неабходна накіроўваць на электронны адрас: ruslitjurn@brsu.by
2. У радку "Тэма" электроннага ліста пазначыць: "Прозвішча, Алімпіяда_БЛ» (напрыклад: Іваноў, Алімпіяда_БЛ).
3. Асабісты лісток ўдзельніка, запоўнены ў адпаведнасці з прапанаванай формай (усе пазіцыі ў лістку ўдзельніка павінны быць запоўнены), адказы на заданні Алімпіяды дасылаюцца асобным файлам у фармаце .rtf Назва файла – прозвішча ўдзельніка.
4. Запрашэнне на ўзнагароджанне пераможцаў будзе адпраўлена ў электронным выглядзе на адрас, пазначаны ў форме ўліковага лістка ўдзельніка.

## ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ

Узнагароджанне пераможцаў будзе адбывацца ў **снежні 2024** года ў межах адкрытага паэтычнага форуму "Пушкінскія сустрэчы на філфаку".

## КАНТАКТЫ

Адрас для перасылкі выкананых заданняў: ruslitjurn@brsu.by

Для ўдакладнення арганізацыйных пытанняў можна звяртацца да дацэнта кафедры беларускага і рускага літаратуразнаўства і журналістыкі Алены Сцяпанаўны Кавалюк (+375 (25) 537 71 47; +375 (29) 795 19 31).

**ЗАВОЧНАЯ АЛІМПІЯДА ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ**

**Паважаныя старшакласнікі!**

Прапануем Вам прыняць удзел у завочнай алімпіядзе па беларускай літаратуры.

Матэрыялы дасылаюцца **асобным файлам у фармаце .rtf на адрас**: ruslitjurn@brsu.by

Апошні дзень прыёму матэрыялаў – **30.11.2024**.

Прафесарска-выкладчыцкі склад кафедры беларускага і рускага літаратуразнаўства і журналістыкі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна жадае Вам поспехаў на шляху да будучай прафесіі!

**Запоўніце** форму ўліковага лістка ўдзельніка **Алімпіяды**

| | |
|---|---|
| Фамилия, имя, отчество участника | |
| Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка | |
| E-mail удзельніка | |
| Кантактны тэлефон удзельніка | |
| Афіцыйная назва ўстановы адукацыі (на рускай і беларускай мовах) | |
| Прозвішча, імя, імя па бацьку настаўніка-куратара | |
| Клас | |
| Дзе плануеце вучыцца? (ВНУ, спецыяльнасць) | |
| Ці патрэбныя вам анлайн-кансультацыі па беларускай літаратуры (удзел – бясплатны) | |

# ЗАДАННІ

1.1 Паразважайце, што дало падставы сучаснікам называць Францішка Багушэвіча “мужыцкім адвакатам”. Як Вы разумееце сэнс сцверджання паэта, што мова – “адзежа душы” народа?

1.2 Параўнайце “адзежу душы” Вашага сучасніка і класікаў нацыянальнай літаратуры.

2.1 Апавяданне Змітрака Бядулі “Бондар” заканчваецца радкамі: “Калі б каго-колечы з нашых Даніла навучыў, той добрым словам успамінаў бы, як бацьку роднага шанаваў. А то ад пані з двара пахвальбы чакаў. Не туды заехаў!

Так гаварылі суседзі”.

Раскрыйце свае адносіны да аўтарскай пазіцыі. Патлумачце канцэпцыю тэмы мастака і мастацтва, рэалізаваную ў творы.

2.2 Паразважайце, для чаго пісьменнік, так дэталёва апісвае працэс вырабу майстрам драўлянага посуду. Абгрунтуйце, кім лічыў сябе бондар і акаляючыя яго людзі – рамеснікам ці творцам.

3.1 Як вядома, раман Кузьмы Чорнага “Пошукі будучыні” пісаўся ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Пералічыце, якія вечныя праблемы ўзняты ў гэтым тэксце. Ад каго і ад чаго, на Ваш погляд, залежыць будучыня асобы, народа, чалавецтва?

3.2 Сфармулюйце чалавеказнаўчыя запаветы класіка нацыянальнай літаратуры. Што дало падставы даследчыкам назваць Кузьму Чорнага беларускім Дастаеўскім?

4.1 Вядома, што “Палеская хроніка”, і ў прыватнасці раман “Людзі на балоце”, былі запаветным творам для Івана Мележа. Раскрыйце актуальнасць праблем, узнятых у тэксце, для сённяшняга чытача.

4.2 Абгрунтуйце, чаму праблема “чалавек і зямля” з’яўляецца нацыяцэнтрычнай для беларусаў.